

Літаратурнае аб'яднанне "AKTAVA"

№ 16
05. 2024

# ЛЕГЕНДЫ БАРЫСАЎСКАГА ЗАМКА

## Апавяданні

Літаратурнае аб'яднанне
"AKTAVA"

# ЛЕГЕНДЫ БАРЫСАЎСКАГА ЗАМКА

**Апавяданні**

Барысаў 2024

## ЗМЕСТ:

Уступ.....................................................................................5

АПАВЯДАННІ

Васіль Лайкоў. СТАРЫ ЗАМАК.......................................6

Марына Помаз. КОНІКІ.....................................................7

Марыя Грудзько.
Валерыя Дзянісенка. ДОМ ПАД НУМАРАМ 5..............9

Анастасія Кірашова. ЛЕГЕНДА СТАРОГА ДУБА.........14

Уладзіслава Дарашкевіч. ВЯШЧУНКА............................16

Васіль Лайкоў. СОН ПАЎЛА РАЗУМНАГА....................19

СТАРОНКІ ГУМАРУ

Вераніка Лайкова. ЗЯЛЁНЫЯ ЧАЛАВЕЧКІ..................22

Міхаіл Помаз. ГАЛАСЫ МІНУЎШЧЫНЫ....................25

Арсеній Попель. ВАРТАВЫ-НЕДАРЭКА......................27

ПАСЛЯСЛОЎЕ.....................................................................30

З ГІСТОРЫІ БАРЫСАЎСКАГА КРАЮ
Павел Шпілеўскі. «ПУТЕШЕСТВИЕ ПО ПОЛЕСЬЮ И БЕЛОРУС-СКОМУ КРАЮ» (урывак з манаграфіі).........................31

АЎТАРЫ НУМАРА..............................................................47

# УСТУП

О, край мой Барысаўскі, край зялёнавокі! Пад шатамі чыстага неба і шумлівых векавых сосен, над пявучымі водамі Схі і Бярэзіны ўзвышаешся ты старажытнымі храмамі, замкамі, насыпамі і курганамі. Усе гэтыя помнікі расказваюць нам, маладым пакаленням, пра тое, як жыў, любіў і верыў, ствараў, змагаўся і перамагаў наш працавіты, шматпакутны, але адважны і непераможны беларускі народ.

Ад заснавання свайго князем Барысам Усяславічам у 1102 годзе да нашых дзён прайшоў ты слаўную гісторыю. Быў гандлёва-рамесным цэнтрам у складзе Вялікага княства Літоўскага, атрымаў Магдэбургскае права, свабоду ад феадальных павіннасцей і магчымасць самакіравання ў часы праўлення вялікага князя Жыгімонта. Не паў, выстаяў у шматлікіх бітвах, знаходзячыся ў складзе Рэчы Паспалітай, а затым - Расійскай імперыі. Праславіўся як месца перамогі над войскам Напалеона і партызанскі край у часы фашысцкай акупацыі, а пасля - як моцны прамысловы горад…

Дзіды стагоддзяў уразаюцца ў сцены непрыступных крэпасцяў, пакідаючы на іх меткі падзей. Старажытны камень захоўвае памяць аб мільёнах лёсаў. Помнікі гісторыі дораць нам веды аб тым, што было. А там, дзе абрываюцца ніткі падзей, і ўзнікаюць пытанні без адказаў… там нараджаюцца легенды…

Гэты альманах прысвечаны Барысаўскаму замку, збудаванаму ў перыяд 12-14 стагоддзяў на левым беразе ракі Бярэзіны. Цяпер ён уяўляе сабой руіны. Пра яго існуюць некаторыя гістарычныя звесткі, але больш – белых плямаў.

# АПАВЯДАННІ

## ВАСІЛЬ ЛАЙКОЎ

## СТАРЫ ЗАМАК

Я стаю на высокім узгорку, абапіраючыся ў яго сваімі старымі нагамі, аблытанымі непраходным быльнікам і зараснікамі дзікага хмызняку…

Травы гэтыя марнелі і адраджаліся восем сотняў разоў з таго часу, як быў я ўзведзены на зямлі Вялікага княства Літоўскага, між берагоў рэк Бярэзіны і Прылы. Толькі размах мой тады быў куды шырэйшы!

На пяць акраў размяшчалася селішча, акружанае моцай маіх драўляна-земляных сцен з пяццю бастыёнамі. Жыццё кіпела тады: кавалі весела стукалі молатамі,ператвараючы руду ў вострую зброю; жанчыны ткалі льняныя палотны, у якія можна было мяне абгарнуць двойчы; воіны на плошчы спаборнічалі ў сіле, рыхтуючыся да баёў; пекары запаўнялі свірны хлябамі, лекары збіралі гаючыя травы; а ваяводы камандавалі паходамі. Шмат таямніц захоўваюць мае сцены, яшчэ больш - падземныя шляхі, якія вядуць да берагоў рэк…

У тыя часы бараніў я мірны народ ад іншаземных ворагаў на працягу стагоддзяў, якія здаваліся мне тысячагоддзямі з-за шматлікіх кровапралітных войнаў з Маскоўскай дзяржавай, Лівонскім ордэнам, польскімі войскамі. Вытрымлівалі мае сцены штурмы і абстрэлы, адраджаліся пасля пажарышчаў. Служылі яны надзейным сховішчам для баявых даспехаў і зброевых складоў…

Але пачалі страчваць сваю моц, калі праз шмат гадоў уварваліся ў мае ўладанні рускія войскі, прыгналі палонных, і не пераможныя клічы, але звон кайданаў, крыкі і стогны загучалі ў маіх сценах… У канцы 19 стагоддзя стаў я турмой.

Пад маім дахам катавалі і пазбаўлялі жыццяў бедных лю-

дзей, якіх я першапачаткова закліканы быў абараняць. Мае сцены насычаліся болем, горам, пакутамі. Я мог назіраць і адчуваць, але не мог нічога зрабіць, бо быў толькі сцяной, якую душагубы выкарыстоўвалі ў нечалавечых мэтах.

Старэў, разбураўся - гэта ўсё, што я мог зрабіць, каб не чуць людскіх стогнаў. Нарэшце, я апусцеў, і паваліўся. Дзікія зёлкі ахуталі маю трухлявую плоць... А што, гэта ж таксама геройства - падзеннем спыніць зло, якое ў табе здзяйсняюць.

Цяпер я ўяўляю сабой толькі некалькі высокіх, але ломкіх цагляных сцен, руіны некалі велічнага, нязломнага замка. І акружаны я не шырокім ровам, напоўненым вадой, як гэта было ў ранейшыя часы, але нізкім плотам, які адлучае мяне ад новых гарадскіх пабудоў.

Людзі прыходзяць, каб паглядзець на мяне, адчуць подых гісторыі. Адны кажуць, што ад мяне ідзе злая энергетыка чалавечых пакут. Іншыя адчуваюць ува мне былую вайсковую моц.

А ёсць і тыя, хто проста адчувае жаданне – дзеля яркіх эмоцый, прагуляцца па сценах, якім восем сотняў гадоў…

…Я ж стаю на сваім узгорку і назіраю за жыццём пакаленняў. Сёння я не крэпасць і не турма, але гісторыя, якую нельга змяніць, і дзякуючы якой народ ведае, хто ён, адкуль, і як яму працягваць жыць, не стаяць на месцы, а ствараць сваю будучыню.

МАРЫНА ПОМАЗ

# КОНІКІ

На летніх вакацыях я прыехаў да сябра, які жыве ў Барысаве. Перш за ўсё я спытаў, якія славутыя месцы ёсць у ягоным горадзе. Вядома, пад словам «славутасці» я меў на ўвазе не тыя аб’екты, якія вабяць футбольных фанатаў, аматараў начных клубаў або прыхільнікаў экстрэмальных атракцыёнаў, а самыя, што ні ёсць, сапраўдныя, кшталту: дамы з прывідамі, праклятыя затокі з русалкамі, або штосьці ў гэткім родзе. Нядоўга думаючы, сябар прапанаваў мне наведаць разваліны барысаўскай крэпасці-турмы, што размешчаны за

прыватным сектарам, на вуліцы Гогаля.

Тое, што вуліца названа імем вялікага містыка, здалося мне сімвалічным, і, карыстаючыся гугл-картай, у адзіноце, зараз жа адправіўся я на пошукі руін.

Вось і гэтаяая вуліца. Дарога ад шумных гарадскіх скрыжаванняў і шматпавярховак павярнула ў закутак, дзе майму погляду прадставілася чарада прыватных трухлявых хацін, з трухлявымі платамі, якія цягнуцца па абодвух баках шурпатай, даўно не рамантаванай дарогі.

Толькі ступіў я на гэтую вуліцу, адчуў жывую прахалоду, навеяную густой зелянінай садоў і травы, якія часткамі прабіваюцца скрозь асфальт. У тую ж хвіліну з-пад ног маіх паскакалі нейкія дзіўныя чорныя конікі.

«Глядзі! - падумаў я, - развялося іх тут! Вось, што значыць –чыстае паветра!»

Я нахіліўся, каб злавіць і бліжэй разгледзець кузурку. Аднак, расціснуўшы пальцы, я знайшоў у далоні чорны даўгаваты каменьчык.

- Што за трасца? - спытаў сам сябе. - Мусіць, выпусціў!

Я меў намер працягнуць свой шлях, але наступныя некалькі крокаў зноў-такі суправаджаліся скачкамі насякомых. Тут ужо я прыцэліўся лепей і схапіў у кулак чарговага скакуна. Расціскаю зноў чорны камень. Шок!

- Што, мілочак, каменьчыкі ловіш? - пачуў я ззаду сябе насмешлівы старэчы голас.

Павярнуўся і ўбачыў маленькую зморшчаную бабульку ў хустцы, павязанай вакол галавы і замацаваным вузлом на лбе: рыхт-у-рыхт, гогалеўская ведзьмарка з «Вія». Каля бабулькі стаяла плямістая каза і трэсла барадой, утаропіўшыся на мяне жоўтым вокам.

- Каменьчыкі? – перапытаў я. - Мне здалося, гэта конікі.

- А ты не дзівіся, мілочак! Тут і не такое бывае. Вось дапамажы казу да хаты давесці, я табе і раскажу.

…Страшнае гэтае месца. Па начах немаведама адкуль то звон ланцугоў цяжкіх чуем, то прыглушаныя галасы. А зірнеш у акно: няма нікога. Мы ўжо і прывыклі.

Там, за дарогай, убачыш ты старыя цагляныя разваліны. Дык

вось, турма гэта была. Аж у пазамінулым стагоддзі паставілі яе царскія ратнікі на месцы старой крэпасці. Колькі народу ў сценах яе было загублена! І салдат палонных, і жанчын са старымі, і дзяцей нявінных. А гэтая вось самая дарога, па якой мы з табой ідзём, была дарогай кандальных. Ішлі яны, збітыя, закатаваныя, параненыя, да месца свайго зняволення і звінелі, звінелі ланцугамі. А калі хто падаў у знямозе, тут жа яго наглядчыкі палкамі і дабівалі.

Здаралася, што нападалі арыштанты на сваіх катаў і сваімі ж ланцугамі душылі іх, а потым уцякалі. Ды толькі ці ўдаваліся ім далёка ўцячы, невядома. Бо паўсюль у акрузе толькі гразкія балоты чарнелі.

Шмат народу палегла на гэтай дарозе, шмат душ кліча аб малітвах нашых. Ды ці зможам мы вымаліць усіх за стагоддзе? Гэта ж трэба, каб кожны з жывых маліўся Богу, ды сам зла не рабіў ніколі, а толькі добрыя справы, ды так - з роду ў род. Можа, тады і выкупім грахі продкаў сваіх.

А каменьчыкі, што падняў, мілочак, не выкідвай. Можа, сваімі справамі годнымі, ды малітвамі сардэчнымі гэтых няшчасных і вызваліш ад пакут вечных.

На гэтым бабулька і скончыла сваё апавяданне, адчыніла трухлявую брамку, перад якой мы апынуліся, і пайшла са сваёй казой у цень дрымотнага саду. І тут я заўважыў, што дзень неяк хутка пачаў змяняцца прыцемкамі.

МАРЫЯ ГРУДЗЬКО

ВАЛЕРЫЯ ДЗЯНІСЕНКА

# ДОМ ПАД НУМАРАМ 5

-Вадзік, мы ўжо цэлую гадзіну топчымся на гэтых пяці метрах і ніяк не можам знайсці патрэбнага нам дома! Вось глядзі: на таблічцы напісана «вуліца Гогаля».

- Так, бясспрэчна, гэта тая самая вуліца.
- Вось нумар дома 3, а вось 7.

– А за імі – тупік.

- Дзе, дзе пяты дом? Куды ён знік?

– Алеся, пачакай хвілінку, я пастукаюся да суседзяў і спытаю ў людзей, дзе нам яго шукаць.

Вадзік працягнуў руку над невысокім плотам і пастукаў у акенца дома нумар 3. У глыбіні двара як быццам чтосці рыпнула. Маладыя людзі прыслухаліся і пачакалі пару хвілін. Але больш ніякіх дзеянняў не было.

- Вадзік, як ты думаеш, няўжо могуць у такім раёне здаваць пакой для кватарантаў?

- Не ведаю, але на фатаграфіі, напрыклад, усё цывільна было.

Алеся азірнулася.

– Але пачуццё такое, што на гэтай вуліцы ніхто не жыве.

Вадзік зазірнуў за плот дома насупраць.

- Так, апраўды пуставата. Там таксама, здаецца, нікога.

- Пойдзем адсюль, - прапанавала Алеся. - Здымем пакой у іншым месцы. А то мне неяк непамысна.

Каб чытач разумеў сітуацыю, у якой аказалі нашы героі, студэнты Вадзік і Алеся, мы скажам што лета - гарачая пара для засялення студэнтаў у арэндныя пакоі і кватэры. Надыходзіць такі момант, што кватэру зняць проста немагчыма, а кватэру па даступным кошце - і таго складаней. Менавіта ў такой сітуацыі аказаліся хлопец і дзяўчына. Пакой у прыватным сектары, які шукалі Алеся і Вадзік, прапаноўваўся зусім нядорага, і гэта быў пакуль што адзіны даступны для іх варыянт.

- Ну не стаяць жа нам тут вечнасць! - усклікнула Алеся, накіроўваючыся да выхаду з завулка.

Вадзіку таксама здалося, што яны стаяць тут ужо даволі доўга, і час у гэтым завулку цячэ неяк інакш. Ён рушыў услед за Алесяй, адчуваючы расчараванне ад нявывырашанага пытяння. Але на выхадзе з завулка перад імі ўзнікла постаць бабулькі, маленькай, шчупленькай, кульгавенькай, але і надта жвавенькай.

- Ой, міленькія мае, ці не вы па аб’яве прыйшлі, пакой шукайце! - весела ўсклікнула яна.

- Так! - Тут жа адазваўся Вадзік.

- Ну дык а я чакаю вас. Выйшла вось насустрач. Ды вы праходзь-

це, мілочкі! Месца ў нас тут спакойнае, ціхае. Касцёл побач, і царкаўка непадалёк.

- Бабуля, а крамы там, аптэкі ёсць якія? - спытала Алеся.

- І як з транспартным забеспячэннем? - дадаў Вадзік.

- Усё, усё ёсць, галубкі мае! І крамы з аптэкай - адразу за паваротам, і паліклініка. Праз дарогу - бургерная, за скрыжаваннем - міліцыя. Аўтобусы добра ходзяць, прыпынак адразу за завулкам. Ды вы заходзіце, галубкі, глядзіце хату. Вось яна, брамка.

- Пяты дом! – усклікнула Алеся, зірнуўшы на Вадзіка.

Ну і ну! Вось жа яна - маленькая драўляная хатка з вокнамі і дзвярыма, пафарбаванымі свежай сіняй фарбай і шыльдай нумар пяць, схавалася ў глыбіні саду. Рабяты аж раты разявілі ад здзіўлення. Адкуль ён тут? Дакладна, што паміж 3 і 7  было пуста.

- А мы яго не бачылі, ваш дом, - нерашуча сказала Алеся.

– Дык за садам, відаць, схаваўся, – усміхнулася гаспадыня і хітра прыжмурыла вока.

Перад уваходам у хатку стаяла прывязаная да брамкі белая козачка з чорнымі плямамі на баках. Убачыўшы гасцей, яна забляяла і пільна паглядзела на іх. Здаецца, козачка як козачка, але ў Алесі марозік прабег па спіне ад гэтай пільнасці. Усё, што адбывалася, здавалася больш чым дзіўным.  Аднак, увайшоўшы ў расчыненыя дзверы, маладыя людзі былі зачараваныя выглядам памяшканняў. Усё было прыбрана  зусім не ў старадаўнім стылі, а вельмі нават сучасна і густоўна.

Іх пакой аказаўся прасторным і зручным, з выхадам у сад. І санвузел знаходзіўся побач.  Алеся і Вадзік практычна адразу забыліся на непрыемную акалічнасць, якая адбылася з імі. А гаспадыня ўжо мітусілася, ставячы на стол гарбату з печывам:

- А вось і гарбатка паспела, галубкі мае! Свежыя травы – сама ў садзе вырошчваю. Мятка тут, любасток, рамонак і чабор. Праходзьце да стала, дарагія.

Водар гарбаты разліваўся па пакоях. Госці не змаглі адмовіцца ад пачастунка. Яны ўсё больш схіляліся да таго, каб зняць пакой у гэтым доме.

- Вас жа клічуць Стэфанія Пятроўна? - спытаў Вадзік. - Запамінальнае імя. А вось месца гэтае нам здалося зусім бязлюдным.

– Дык жа лета! - усміхнулася бабулька. - Людзі па дачах раз’ехаліся. Хаця месца гэта і праўда незвычайнае.

Алеся з Вадзікам  пераглянуліся.

- Незвычайнае, праўда! – пагадзілася Алеся. - Заблудзіліся ў вас тут, як у трох хвоях. Дом ваш не маглі знайсці.

Стэфанія Пятроўна засмяялася.

- Хатка мая рухацца не ўмее. Хаця ў народзе кажуць, што ёсць такі садовы дзед Лазавік. Вось таго хатка на сваіх нагах ходзіць, а ўбачыўшы незнаёмцаў, уцякае і хаваецца ў зарасніках саду, каб заставацца незаўважанай. А мой дом просты, дом як дом.

- У чым жа дзівацтва месца? - Спытаў Вадзік.

- Ды вось жа гісторыя якая. Стаіць наша вуліца на месцы старажытнага паселішча. А размяшчалася яно ля падножжа барысаўскага замка. Устаноўлены быў замак у 12 стагоддзі першымі князямі Барысаўскімі, каб абараняць горад ад іншаземных войскаў. Бо размяшчэнне Барысава – на шляху ад Вільні да Масквы. Яно зручнае ў многіх сэнсах, але і небяспечнае адначасна. Усе захопніцкія войны з захаду і ўсходу закранулі Барысаў. Усе гандлёвыя шляхі праходзілі праз яго. Добра тут ішоў гандаль, але і войн было шмат. І гарэў замак Барысаўскі, і ўзводзіўся нанова, уставаў, як птушка Фенікс з агню.

Месца, дзе мы з вамі зараз знаходзімся, было падножжам замкавай гары, а дарога, што за брамкай, была шырокай і вяла да перакіднага моста праз роў. Шмат люду ішло па гэтай дарозе ў замак. І купцы везлі свой тавар на абозах: футра, тканіны і мёд. І збройнікі вялі вазы са зброяй, бо на тэрыторыі замкавага селішча размяшчаліся зброевыя склады. Народ просты нёс даніну, устаноўленую князем Вітаўтам: мёд, зерне, сыр і шмат іншага. Ды і палонных пасля бітваў канваіры вялі гэтай дарогай у замкавую вязніцу.

Замкавая сцяна ўзвышалася грозна на гары, утвараючы крэпасць. У часы войнаў жыхары Барысава збягаліся ў крэпасць, ратуючыся ад ворагаў. З гэтага боку адчыняліся цяжкія дубовыя вароты, сустракаючы народ. З зваротнага боку замка размяшчаліся таемныя падземныя хады, якія вялі да ракі. Ці ратаваўся хто, уцякаючы з замка, ці выходзіў у гадзіны аблогі за вадой - падземныя хады былі незаменныя.

Так, казаць пра замак можна шмат. Нават легенды розныя існу-

юць пра яго. А між тым, галубчыкі, гарбатка стыгне.

- Раскажыце легенды, Стэфанія Пятроўна! - папрасіла Алеся.

- Раскажыце, калі ласка! Гэта вельмі цікава, - падхапіў Вадзік.

- Эх вы, маладыя - дапытлівыя! Як нагавару вам, дык адмовіцеся тут пакой здымаць.

-Не адмовімся, Стэфанія Пятроўна!

- Цяпер ужо дакладна не адмовімся! – наперабой загаманілі маладыя людзі.

– Ну, легенды – гэта толькі легенды. Казка - хлусня, - усміхнулася бабулька, падліваючы гарбату ў келіхі гасцей. - Між тым, хаты на гэтай вуліцы і праўда могуць хавацца ад незнаёмцаў, але не дзесьці ў садзе, а ў парталах часу, - бабулька, прыжмурыўшыся, паглядзела на гасцей.

- Парталы часу? Гэта ж цікава! - Усклікнуў Вадзік.

- Калі–нікалі  і ў нашае вымярэнне  могуць заходзіць няпрошаныя госці з мінулага. Праўда, яны бяскрыўдныя, зрабіць нічога нікому не змогуць. Толькі шумяць.

- Прывіды ці хто? – насцярожылася Алеся.

- Такое ўжо гэта месца! - уздыхнула Стэфанія Пятроўна. - між тым мы, старажылы вуліцы Гогаля, даўно прызвычаіліся да дзівосаў гэтага месца.

- А легенды раскажыце нам, калі ласка, - папрасіў Вадзік.

Ды  далей здарылася нешта яшчэ больш дзіўнае.

Вадзік, як і Алеся адчулі, як іх захапіў непераадольны сон. Спачатку як бы паплыў вакол іх пакой, потым яны акунуліся ў дрымоту, але толькі на хвілінку, і вынырнулі з яе. І што ж?

Абудзіліся яны ў зусім іншай прасторы. Алеся адчула ў сваёй руцэ палаючую паходню. У першы момант ледзь не кінула яе на зямлю, але не зрабіла гэтага, агледзелася вакол. Што за чартаўшчына?

Яна знаходзілася ў падзямеллі. Але не адна, а з групай сярэднявечных вояў, апранутых у лёгкія даспехі. Побач з ёй стаяў Вадзік. Што такое? І ён у даспехах. Алеся раптам усвядоміла, што і яна нібы не знаходзіцца ў сваім целе. Яна - салдат у жалезнай брані, які блукае па падзямеллі з паходняй у руках.

-Вадзік, - паклікала яна сябра і не пазнала свайго голасу. Ён быў нізкі, мужчынскі.

У гэты час пачуўся рэзкі голас:

- Што стаім, разявы! За вадой - маршавым строем! Аць-два! - гэта быў голас камандзіра. Салдаты, бразнуўшы латамі, вокамгненна пабудавалі шарэнгу, немаведама адкуль у іх руках з'явіліся бочачкі для вады. Шарэнга накіравалася ўздоўж падземнага калідора. Алеся ішла з паходняй, асвятляючы шлях. А наперадзе віднелася пляма святла. Здаецца, выхад з падзямелля. І яшчэ. Побач з ёй перабірала ножкамі немаведама адкуль узніклая плямістая козачка…

АНАСТАСІЯ КІРАШОВА

# ЛЕГЕНДА СТАРОГА ДУБА

За пешаходным мастом праз Бярэзіну, у маленькім, але прыгожым батанічным садзе пры экалагічным цэнтры ёсць велізарны стары дуб. Колькі вякоў стаіць ён паміж трох маленькіх люстраных азер – невядома. Гадоў пяцьсот ці больш? Абхапіць яго таўшчэзны ствол можна толькі узяўшыся за рукі карагодам. Калі прыглядзецца да яго грудкаватай кары, то можна заўвацыць на ей старадаўні заруб, нібы шнар на целе ваяра. Ніхто не ведае, адкуль ён узяўся.

Неяк прыйшла я да гэтага волата ды й запытала:

– Адкуль, паважаны дуб, гэты шнар на целе тваім?

І прапеў дуб мне сваю легенду.

***

Па пясчанай дарозе, цяжка дыхаючы, мераў крокі конь, запрэжаны ў стары рыпучы воз.

- Яшчэ трохі, амаль прыйшлі! - угаворвала дзяўчына каня. - Зірні, вось жа ён, замак! Які вялікі!

Конь спыніўся каля бярвеністай брамы.

– Стоооой! Хто ідзе? - у адзін голас спыталі дазорныя.

Дзяўчына падняла галаву, і шаперон яе саслізнуў з галавы на плечы, адкрыўшы прыгожыя бялявыя валасы.

- Я вязу мёд, як загадаў сір, - нясмела адказала яна.

- Як шкада, што толькі мёд… - пачалі было здзекліва выкрыкваць дазорныя, заліваючыся рогатам на сцяне замка.

-Прапусціць! – пагрозлівым голасам хтосьці перапыніў весялосць. Дубовыя вароты павольна адчыніліся.

На уваходзе стаяў камандзір у жалезных даспехах

– А нічога сабе, прыгожанькая! - напышліва ўсміхнуўся ён. - Гэй, конюх, завядзі каня ў стайню і разгрузі воз.

З–за спіны камандзіра выйшаў невысокі моцны хлопец.

– Слухаюся! – адсказаў ён, узяўшы лейцы ў руку.

Дзяўчына рушыла ўслед за ім, адчуваючы на спіне холад ад позірка камандзіра.

– Выбачайце за дазорных, – нягучна прамовіў хлопец, не гледзячы на дзяўчуну. – манерам іх не вучылі. Мяне клічуць Яраслаў, ці магу я даведацца ваша імя? - спакойна і ўпэўнена спытаў конюх незнаёмку.

– Мяне клічуць Агнес, – на шчоках дзяўчыны з’явілася чырвань.

Калі яны дайшлі да стайні, ім не хацелася развітвацца. І Яраслаў прапанаваў ёй сустракацца за ровам каля дуба кожны раз, калі Агнес будзе прыходзіць па справах у замак.

***

Так і зрабілі. Кожны раз, калі дзяўчына везла мёд, на зваротным шляху яны сустракаліся ў прызначаным месцы.

Аднойчы Агнес чакала Яраслава каля дуба. Сонца хілілася да захаду, і дзяўчына пачала хвалявацца. Каля дуба шпацырным крокам ішоў камандзір.

- О, гэта ты? Што ты тут робіш…. адна? Прызнацца, твая прыгажосць зачароўвае. Вочы, як азёры, у іх можа патануць любы. А можа ты ведзьма?!

Усё бліжэй і бліжэй падыходзіў ён да дзяўчыны.

– Не чапайце яе! – крыкнуў Яраслаў.

– О! І хто ў нас тут заступнік? Конюх? Звязаць здрадніка!

Двое воінаў звязалі вяроўкамі рукі Яраслава. Спрабуючы вызваліцца, хлопец закрычаў:

– Бяжы!

– Калі ты ўцячэш, то я загадаю адсекчы яму галаву ці павесіць за

здраду вялікаму князю. Што лепш? – вар’яцеў ад злосці камандзір.

Агнес прыціснулася да дуба:

– Адпусціце яго! Што Вам патрэбна? Я зраблю ўсё….

Рукі камандзіра пацягнуліся да дзяўчыны.

У той момант Яраслаў здолеў вызваліцца ад вяроўкі і кінуўся на непрыяцеля, выхапіўшы меч у аднаго з воінаў. Завязалася бойка. Адолеўшы двух вояў, Яраслаў грудзьмі захінуў каханую, трымаючы меч у параненай руцэ.

– Прызнайся, гэта канец, цябе пакараюць смерцю... А яе спаляць на вогнішчы... Па маім загадзе.

-Дай нам сысці! – папрасіў Яраслаў.

-Вядома, бяжыце ...

Хлопец апусціў зброю, павярнуўся да дзяўчыны, і ў гэты момант два сэрцы працяў камандзірскі меч.

– Мы заўсёды будзем разам, я цябе кахаю - прашаптаў Яраслаў, выпусціўшы з рукі меч.

-І я цябе кахаю! - Абняла яго Агнес, пахіснуўшыся.

Яны павольна апускаліся на зямлю, а на дубе застаўся заруб ад мяча і крывавы след умілаваных сэрцаў.

У паніцы забойца паспрабаваў збегчы, але запнуўшыся аб камень, скаціўся ў глыбокі роў. Больш яго ніхто не бачыў.

УЛАДЗІСЛАВА ДАРАШКЕВІЧ

# ВЯШЧУНКА

Быў гарачы жнівеньскі поўдзень тысяча пяцьсот чатырнаццатага года ад нараджэння Хрыстовага. На аршанскай дарозе загрукалі капыты, і з’явілася незлічоная чарада коннікаў. То вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч вёў чатырохтысячнае воінства да Барысаўскага замка.

Чуліся прыглушаныя размовы воінаў аб бітве за Смаленск, якую літоўцы прайгралі рускім войскам, і аб тым, што нядаўна даведаўся князь ад рускага ваяводы Міхаіла Глінскага. А распавёў гэты ба-

ярын, што прывёў цар Васіль для захопу земляў Вялікага княства Літоўскага войска колькасцю восемдзесят тысяч салдат і палкаводцаў. Казаў жа гэта Глінскі Жыгімонту таму, што гатовы перайсці на яго бок і дапамагаць князю ў абарончых баях, паколькі злы баярын на вераломнага цара, які не аддаў яму абяцаных заваяваных земляў.

Дарога пыліла, хіліўся кавыль да конскіх капытоў. Князь ехаў у маўклівым роздуме. Ваеначальнікі ўгаворвалі яго:

- Расійскае войска засцілае гарызонт сваёй колькасцю, мы не пераможам, князь! Трэба адыходзіць!

Салдаты наракалі. Жыгімонт падняў галаву і акінуў воінаў грозным позіркам.

- Не! Мы не можам уцячы, ганебна падціснуўшы хвасты, як сабакі! Калі гінуць, то, як сапраўдныя воіны - у баі!

Толькі вымавіў гэта, устаў княскі конь, як укапаны, на дарозе, і ні кроку наперад. Адкуль ні вазьміся - з паветра, ці што, саткалася? – паўстала перад ім сівая жабрачка ў лахманах.

— Літасцівы спадар, ці не знойдзецца кавалачка хлеба для беднай жанчыны? - спытала яна, укленчыўшы.

- Ды як смееш ты, абарванка, гаварыць з самім вялікім князем? Прэч з дарогі! - замахнуўся на яе бізуном адзін з военачальнікаў.

- Стой! Дай ёй хлеба! - спыніў падначаленага Жыгімонт.

Жанчына прыняла пададзены акрайчык.

-Дзякую, вялікадушны князь! Век не забуду тваёй літасці! — пакланілася ўбогая і знікла, нібы не было яе.

- Ведзьма! - пранеслася нараканне сярод салдат.

Жыгімонт тузануў лейцы, і конніца рушыла далей.

… Разліваўся закат вячэрні, маністы яго мігацелі ў галінах схіленых дрэў.

- За лесам адкрыецца бераг ракі - павядзем коней да вадапою! - абвясціў Жыгімонт. Стомленыя воіны ажыўлена страпянуліся. І толькі дасягнулі яны канца гушчару, аддзялілася ад дрэва цёмная постаць і паклікала князя рукой.

- Як? Зноў яна! - у галасах салдат чуўся спалох, як толькі перад імі зноў узнікла жабрачка.

- Княжа, сыдзі з каня, зрабі ласку! Раскажу табе прароцтва! - прамовіла жанчына, кланяючыся.

-Князь, яна ведзьма, забіце яе! - ускрыкнуў ваеначальнік, аднак Жыгімонт адмахнуўся ад яго і спусціўся з вернага каня.

- Быць пабоішча вялікаму! Загрымяць дзіды ды мячы, застогне зямля пад капытамі коней! Шмат коней і людзей у ворага твайго, князь! Але ласкі тваёй я не забываю, а таму пасварацца военачальнікі расійскія, ды расколецца іх войска вялікая! Трэснуць дзіды іхнія, зламаюцца мячы, памруць коні! Вынясуць ворага рэкі хуткія, ды надасць табе сілы вада родная! Памятай маё прароцтва! - сказала жабрачка і прапала.

Паехала напалоханае войска далей. Пры ўездзе ў замак, ля маста, зноў убачыў Жыгімонт жабраку. У руках жанчыны быў збан, да краёў вадзіцаю напоўнены.

- Пі, княжа, ды воінаў сваіх напаі! Будзе з табой сіла! - пацягнула жабрачка пасудзіну. Жыгімонт прыняў збанок з рук вяшчункі, а яна і знікла.

- Зелле вядзьмарскае! Не пі, князь! - узмаліліся военачальнікі.

-Маўчыце! - загадаў Жыгімонт і адпіў са збана. - Піце, загадваю вам! Ды будзе ў нас сіла!

Выпілі воіны вадзіцы, ды адчулі ў сабе моц вялікую.

.... І быў бой вакол замка Барысаўскага. І быў далей, за яго межамі. Ламаліся ў бітве дзіды, гінулі людзі ды коні. Пасварыліся рускія князі паміж сабой, падзялілася войска шматтысячнае!

Перамагаў вялікі князь Жыгімонт са сваім войскам. Беглі маскоўцы, дабівалі іх літоўцы! Бачныя на полі былі целы забітых, зямля напілася іх крывёю! Хто стагнаў ад цяжкіх ран, хто паміраў, хто быў прыціснуты цяжкімі тушамі мёртвых коней.

Кінуліся рэшткі рускага войска біцца з літоўцамі, і пачалі ўжо перамагаць, як раптам на дапамогу літоўцам прыйшлі палякі і адціснулі расіян да ракі Бярозы. Патанулі рускія салдаты, панесла іх плынь хуткая! Так многа загінуўшых воінаў было, што рака выйшла з берагоў!

Перамог князь Жыгімонт у бітве няроўнай!

Баляваў ён у замку з ваярамі вернымі і не бачыў, як пад вокнамі прайшла жабрачка, якая тройчы з’яўлялася войску. Ступіла яна ў адчыненую браму, але тут жа была схоплена стражнікамі ды ваяводам, што ўгаворваў князя не слухаць яе.

Угневалася вяшчунка і прамовіла:

- Ці не павінен князь аддзячыць мяне за падмогу?

- Якая такая дапамога, старая? - насміхаўся ваявода. - Не бачылі мы цябе з мячом на полі баявым. Хіба што ворага выглядам сваім напалохала.

Вочы вядзьмаркі гнеўна бліснулі. У жаху ваявода выхапіў меч і працяў сэрца жанчыны. Загадаў ваярам сваім кінуць цела яе ў раку з абрыву.

У гэты момант скалануліся сцены замка, і пачулі князь ды ваяры яго страшны вядзьмарчын голас:

- Прарочыла я вам перамогу... Вы ж забілі мяне! Слухайце ж, няўдзячныя! Замак гэты, што апорай сягоння з'яўляецца, абернецца турмой. Прастаіць ён моцна шмат стагоддзяў... Але будуць у ім нявінных людзей мучыць! Такая мая помста!

…Сцякаліся воды Бярэзіны. Панеслі яны цела мёртвае вяшчункі, як неслі трупы варожыя.

…І скрозь сотні гадоў здзяйсняліся прароцтвы.

ЛАЙКОЎ ВАСІЛЬ

# СОН ПАЎЛА РАЗУМНАГА

*Прысвячаецца даследчыку гісторыі*
*Барысава Паўлу Шпілеўскаму*

Я прачнуўшыся раніцай - адной з тысяч. Я уліўся ў плынь часу і зразумеў, што на гэты раз усё не так, як раней. Звычайна раніца сустракае мяне сонцам з-за гарызонту, яно струменіць асляпляльнымі прамянямі, абуджае ад утапічнага забыцця сняжынкамі пылу, якія кружацца ў святле і разлятаюцца ва ўсе бакі ад майго лёгкага дыхання.

На гэты раз я адчуў, што мяне разбудзіла не раніца, а зацьменне. Яно звычайна не абуджае, а наадварот - накрывае рэчаіснасць заслонай таямніцы і ахінае розум спакоем. Але ў гэтую раніцу я не адчуў

спакою, а зразумеў, што не магу дыхаць. Мяне абудзіла зацьменне, што выхапіла з маёй плоці сонечныя промні і забрала маё паветра. Зацьменне спустошыла жыццёвую скарбніцу, якую я сабраў цаной часу, што пражыў на гэтай зямлі. Мой розум - мой спакой. І пакуль я думаю, я дыхаю і жыву.

Таму, калі мая галава стала адлятаць у сон ад пахіленага ценю, што наплыў на вочы, я адчуў, што сцены маёй келлі пачынаюць сціскацца, а ранішнія пылінкі, якіх цяпер ужо зусім нельга было разгледзець, счапляліся даўкімі камякамі і пранікалі ў мяне, скоўваючы дыханне.

Падлога перастала трымаць мяне, і я пачаў павольна правальвацца ўніз, беспаспяхова спрабуючы ўхапіцца спачатку за ложкі ў ніжніх пакоях, потым за прарослыя ў зямлі карані дрэў, а пасля, ужо ў стане роспачы - за ўласныя часткі, якія зараз пачалі аддзяляцца ад мяне і ператварацца ў самастойныя, такія ж абязчалавечаныя, як і я, арганізмы.

Перада мной з'явілася бібліятэка. Насамрэч цяжка было назваць бібліятэкай тое, з чым я сутыкнуўся. Гэта быў нявядомы мне раней свет ведаў і дасягненняў чалавецтва, які ўяўляў сабой бязмежную залу, дзе было ўсё: арыфметычныя запісы Піфагора і палітычныя трактаты Арыстоцеля, дыялогі Платона і трагедыі Сафокла; тут знаходзіліся працы невядомых мне філосафаў будучага часу, дзеячаў мета-мастацтва і мета-навукі, якія адкрылі трансцэндэнтныя шляхі, адштрухоўваючыся ад нашых - зямных. Мяне ахапіў спачатку дзікі жах, але здранцвенне хутка прайшло, і я стаў прагна ўглядацца ўва ўсё, што мяне акружала, каб захаваць у сваёй памяці як мага больш.

Але тут я зразумеў, што ўяўляю сабой толькі нешта, пазбаўленае частак, якія дазвалялі мне быць самім сабой. Усё, што я так заўзята слухаў, тут жа вылівалася з мяне, нібы я - шкілет, які спрабуе выпіць з напоўненага віном кубка. Зацьменне зрабіла мяне кропкай ў плоскасці. Я стаў аднамерным - сапраўды не існуючым. Я ўжо з усёй лютасцю, што толькі магла сабрацца ў маёй нікчэмнай сутнасці, стараўся выгрызці хаця б імёны і тытулы, выціснутыя на карэньчыках фаліянтаў. Але нават гэта мне не ўдавалася - у галаве толькі згушчалася беспадстаўная нянавісць да ўсяго навакольнага. Я выдатна

разумеў тое, што я слабы і агідны самому сабе. І я ведаў, што ўсяму віной блюзнерскія архаікі Дэкарты і Галілеі, іх адэпты ў вобразах Геґеляў і Ніцшаў, разбуральнікі рэальнасці Сальвадоры Далі, Томасы Вульфы і Джоны Кейджы. Гэта не я вінаваты ў тым, што нарадзіўся чалавекам і быў абцяжараны бесперапыннымі блуканнямі ў сваіх думках. Чаму я не магу адхіліцца ад сваёй натуры і супакоіць розум ва ўтульным змроку вечнага зацьмення?

Таму што я... Я ёсць маё зацьменне.

У гэты раз раніца сустрэла мяне звычайнымі сонечнымі промнямі, кінуліся ў скокі пылінкі, пашырыліся сцены. Я напоўніў лёгкія свежым прасторным святлом, пасля чаго выпусціў яго, яшчэ больш раскідаўшы вясёлыя сняжынкі. Я падумаў: калі чалавецтву наканавана напоўніцца ведамі да такой ступені, што яно накрые сябе коўдрай векавых дасягненняў і ператворыць будучыя пакаленні ў мільёны, мільярды вечных немаўлят, якія спяць пад ёй, то так таму і быць. Цяпер мы ствараем тое, чаго не створаць пасля нас.

Я зірнуў у акно, з якога на мяне мяккім падпякаючым святлом струменіўся нябесны абшар. Я перавёў погляд ледзь ніжэй і яшчэ некалькі хвілін з зацікаўленасцю разглядаў беражліва ўзараныя палі.

Пасля гэтага, павольнымі і ўмелымі рухамі я завязаў на туніцы пояс, узяў доўгія валасы ў хвост і пакрочыў у скрыпторый свайго розуму.

# СТАРОНКІ ГУМАРУ

ВЕРАНІКА ЛАЙКОВА

## ЗЯЛЕНЫЯ ЧАЛАВЕЧКІ

- Каравул! На горад напалі! Ворагі ўжо ў замку! - крычаў, узабраўшыся на вежу вяшчальніка, стары Кагач.

Вакол вежы на плошчы сабраўся ледзь не ўвесь барысаўскі люд. Прыбегла нават гарадская ахова.

- Дзе злачынцы? Куды схаваліся? Пакажы нам!

Кагач толькі махаў рукамі і выкрыкваў малазразумелыя фразы:

- Чужакі, зялёныя чалавечкі! Засланцы д'ябла! Яны сярод нас! Згуба нам, згуба!

Ахоўнікі намагаліся супакоіць народ:

- Ніякіх ворагаў у замку няма. Звар'яцеў стары.

Людзі пачалі пацiху разыходзіцца, як раптам з натоўпу выскачыў жвавы мужычок:

- А я веру Кагачу! Ён чалавек талковы, ніколі не маніць.

З-за спіны мужычка выглянуў хударлявы чалавек вучонага выгляду ў цёмным плашчы і сказаў:

- Мяне напраўду зацікавілі вашы «зялёныя чалавечкі». Хадзем жа разам іх шукаць!

Вочы Кагача заблішчэлі, і ён натхнёна прамовіў:

- Ха-ха! Вось мы і выратуемся. А вас, небаракаў, пагібель чакае! Ха-ха!

Стары злез з вышкі і далучыўся да кампаніі мужычка і вучонага.

Мужычок паклаў рукі па плечы дваім суразмоўцам і аб'явіў:

- Што ж, сур'ёзная работа нам выпала. Ды і мы, панове, не промах!

- Але ж чаго мы стаім? - усхваляваўся Кагач. - Зялёныя чалавечкі не спяць...

- Спяць, не спяць - розніцы мала. У любой справе распарадак

патрэбен, план. І па гэты план я прапаную звярнуцца ў карчму. Сёння вас частую!

Трое накіраваліся за рог вуліцы, да нізкай драўлянай будыніны.

***

- Ты, Кагач, не пераймайся, - казаў мужычок, падліваючы дзеду ў кубак медавуху, - а раскажы ўсё па парадку пра гэтых чалавечкаў.

- Чалавечкаў-та я амаль не бачыў, - няўпэўнена пачынаў Кагач, - але чуў. Раніцай прачнуўся ад грукату і нейкага дзынькання са свістам. Выходжу ўва двор і бачу: па дарозе коціцца павозка - але зусім дзіўная - з маленькімі коламі, і быццам бы сама, без коней едзе. А наверсе - тры нібыта чалавекі, але замест адзення - скрыні расфарбаваныя. Вось і здалёк падалося, што целы іх таксама былі нейкага дзівоснага колеру. Гаманілі не па-нашаму, і, здаецца, на цымбалах гралі. Я міргнуў - іх ужо не было. Вось тады і пабег на плошчу людзям пра ўбачанае паведаміць.

- Дык то-ж табе, пэўна, здалося! - пасміхнуўся мужычок.

- А між іншым, - запярэчыў вучоны, - старажытныя кнігі апісваюць і нават тлумачаць такія прышэсці, - сказаўшы, дастаў з кішэні кніжачку і разгарнуў яе на старонцы з ілюстрацыямі. - Зірніце: вось яны, зялёныя чалавечкі ў скрынях! Кажуць, што яны прылятаюць з неба, то бок з іншых планет - такіх жа, як наша Зямля. Адпаведна, і выгляд у іх будзе падобны на наш, і паводзіны.

- Адкуль яны прыляцелі, то нецікава - казаў Кагач. - Але вядома, што нічога добрага яны нам не жадаюць. Мне здаецца, іх не трое, а нашмат болей. Калі я бег на плошчу, па дарозе на чымсьці паслізнуўся і ўпаў. Падымаюся, гляджу - лужына зялёнага колеру! То іхніх рук справа, няйначай!

- Вось што, - перабіў субяседнікаў мужычок. - Мы аб'явім пошук зялёных чалавечкаў. Ты, Кагач, добрую справу сёння на плошчы рабіў, але дарэмна адзін выйшаў, бо аднаго за вар'ята хутчэй прымуць. Я чалавек уплывовы ў горадзе, пойду вяшчаць. А ты, вучоны, расклейвай па слупах карцінкі, як у кніжцы тваёй, і людзям асвету праводзь. Ты, Кагач, як я бачу, дасканалы сышчык. Шукай чалавечкаў па зялёных лужынах.

- Будзе - ік! - зроблена! - Кагач дапіў апошнюю кроплю медавухі

і павярнуўся да карчмара са словамі: - Яшчэ адзін кубак! Праца мяне чакае важная і - ік! - адважная!

***

Другі кубак, на здзіўленне Кагача, прагі змагання з зялёнымі ворагамі не дадаў, а дадаў жадання выйсці на вуліцу і спяваць ва ўсё горла.

- Ой трава-а-а на дварэ-э-э! На дварэ-э-э зеляна-а-а! - задрыжэла ў мурах Барысаўскай крэпасці, загучала ў векавечных лясах над шырокай Бярэзінай.

На прадстаўленне Кагача глядзела ўся вуліца. Заўважыўшы на сабе цікаўныя позіркі, Кагач адчуў сябе сапраўдным артыстам. Ён прагнуў увагі кожнага мінака, і дзеля гэтага быў гатовы на ўсё. Ён адышоў за карчму, узяў са сметніцы пустую бочку і апрануў на сябе.

Не захавалі летапісы паведамленняў пра тое, колькі доўжыўся канцэрт, але дакладна вядома, што скончыўся ён радкамі:

- Ой трава-а-а, ой зеляна-а-а-ах! - Кагач пазіхнуў, хіснуўся, упаў, пакаціўся ў бочцы і салодка захрапеў.

Раптам аднекуль пачулася:

- Зялёны! Ловім!

З ценю між будынкаў выслізнулі двое хлопцаў, падбеглі да Кагача, паднялі і пацягнулі назад у цень.

***

Прачнуўся Кагач ад дзіўнага скрыпу і свісту - такога ж, які чуў раніцай у двары. Ён прыўзняўся, азірнуўся, і - о жах! - яго акружалі чалавечкі ў каляровых скрынях. Яны трымалі ў руках дзівосныя музычныя інструменты, падобныя ці то на лютні, ці то на гуслі, якія і выдавалі той дзіўны гук. Адзін з чалавечкаў - у трохкутнай чорнай скрыні - падышоў да Кагача і прамовіў:

- Не пужайся, стары! З намі спяваць будзеш. Спадабалася нам тваё выступленне! - і падаў яму руку. Кагач падняўся, паправіў на сабе бочку, перахрысціўся і прашаптаў сабе пад нос:

- Была ні была, к чорту зялёнаму!

Артысты выйшлі на гарадскую плошчу і далі небывалы рок-канцэрт. І я там быў - барабаншчыка замяняў. Вы спытаецеся: што з барабаншчыкам-та сталася? А вось што: яго так спакусіла мясцовая

медавуха, што з раніцы ён адлучыўся ад калектыву. Зялёныя лужыны - яго аўтарства. Чаму зялёныя? - летапісы не пакінулі звестак. Напэўна, хмель у тым далёкім 1481 годзе выдаўся надзвычай сакавіты. Усё ж барысаўскі край з яго прыродай - сапраўднае багацце беларускай зямлі!

# МІХАІЛ ПОМАЗ

# ГАЛАСЫ МІНУЎШЧЫНЫ

Калі ў горадзе Барысаве ўлетку зірнуць на мост цераз раку Бярэзіну, можна заўважыць цуд: хлопцы ды мужыкі, падпіўшы для смеласці, кідаюцца з дзесяціметровай вышыні акурат у цэнтр ракі, робячы вялікія хвалі. І ніводны чалавек, нават самі хлопцы-экстрэмалы не ведаюць, нашто ім патрэбны тыя скокі. Насамрэч, гэта дзея мае вялікі сакральны сэнс і усхваляе традыцыі продкаў. Зараз распавяду вам, адкуль узялася гэта традыцыя. Шмат год таму, калі князь Барыс толькі заснаваў горад, паклаўшы першую цагліну ў кааператыўнае будаўніцтва, рака Бярэзіна была значна глыбей і шырэй, чым зараз. І панаваў у ёй вадзяны цар Бабэлік. Не спадабалася цару, што Барыс без дазволу будуе горад, а найбольш раззлавала Бабэліка тое, што навёў Барыс цераз Бярэзіну вялікі мост, перагарадзіўшы ўсю раку. Вырашыў Бабэлік помсціць. Паслаў вадзянік да княскіх рыбакоў атручаную рыбу, але акрамя прыгонных кітайцаў яе ніхто не каштаваў. На кітайцаў атрута не падзейнічала (вы самі ведаеце, якая там у іх экалогія), таму Бабэлік зрабіў іншую шкоду: патапіў усе чаўны князя Барыса. Барыс кінуўся шукаць злачынца, але княскі чараўнік Чучмек, паваражыўшы на сабачых костках, папярэдзіў князя: «Барыс, тое зрабіў не чалавек, а вадзяны цар. Пэўна, злуе на цябе за горад і мост, што будуеш без яго дазволу. Сцеражыся вады.»

Але не з тых быў Барыс, хто баіцца вадзяных нячысцікаў. Загадаў ён сваім ваярам знайсці падводнага цара і прывесці да яго. Начапілі коннікі акваланці на сябе ды на коней, узнялі «Пагоню» і паехалі

ў раку шукаць цара.

Бабэлік не чакаў, што так хутка за ім прыедзе княская конніца (ён наогул не чакаў, што пад вадой за ім прыедзе конніца), таму вельмі спужаўся ды схаваўся пад старым карчом. Схапілі тады коннікі ў палон вялізную шчупачыху Марусю, бабэлікаву жонку, ды зараўлі на ўсю раку: «Цар рачны, выходзь, а калі не выйдзеш, дык засмажым тваю жонку!»

Моцна кахаў Бабэлік Марусю, таму выпаўз з-пад карча і мовіў: « Пусціце Марусю, гэта не яе вайна. За тое, што ваш князь улез у мае землі без дазволу, вызываю яго па разах, адзін на адзін. Пераможа мяне - не буду больш шкодзіць.» Коннікі адпусцілі шчупачыху ды паехалі на бераг.

Тым жа вечарам бакі дамовіліся пра час і месца «стралы»: назаўтра, ранкам, на мосце цераз Бярэзіну.

Узышло сонейка. Рака пад мостам кішэла русалкамі, вадзянікамі, рыбай і іншай рачной поскудзю - балельшчыкамі з боку Бабэліка. На абодвух берагах ракі сабраўся і чалавечы натоўп - балельшчыкі Барыса. Неўзабаве на мосце з’явіліся два князя - зямны і рачны. Публіка ровам і віскам сустрэла сваіх герояў. Супернікі ўзнялі мячы, і суддзя скамандаваў: «Бокс»!

Біліся доўга. Не на жыццё, а за ўладу, і гэтая бойка была больш жорсткая, чым проста за жыццё. Мінула гадзіна, затым другая. Сонца ўзышло высока і пачало няшчадна смаліць князёў і публіку. Барыс і Бабэлік, мокрыя і стомленыя, ледзь варушылі мячамі, і тут Бабэлік дапусціў фатальную памылку: робячы выпад на Барыса, вадзянік паслізнуўся, паваліўся і выпусціў меч у раку. «Гэта фіяска, братан!» - Барыс падыйшоў да Бабэліка, паставіў нагу яму на галаву і спытаў: « Ну што, пудзіла, дазволіш дабудаваць горад, ці адсячы табе галаву?»

«Не-е-е!!!!» - Бабэлік узроў, крутануўся як змей, і паляцеў у ваду.

- Чорта з два табе, Борка, свіны лыч! - здзекваўся Бабэлік плаваючы пад мостам.

Барыс пачарнеў ад злосці. Ніхто яшчэ не абражаў яго так! Раз’юшаны князь, увесь закаваны ў жалеза, «бомбачкай» скочыў у Бярэзіну па Бабэліка. Рачны цар, самааддана смеючыся з Барыса, не заўважыў, як той ляціць на яго з моста. Таму, калі Барыс «мяккім месцам» трапіў Бабэліку на галаву, цар страціў прытомнасць. Апошняй думкай у Бабэлікавай галаве прамільгнула: «Чаму князь

такі паджары, а зад у яго такі важкі?».....

Барысавы ваяры, узрадаваныя перамогай, так сама пачалі скакаць у раку з моста, глушачы русалак і рыбу. Шмат тады паглушылі дружыннікі рачной поскудзі, і была ў той дзень надзвычай багатая вячэра, якую назвалі «Рыбны дзень». А злога і хітрага рачнога цара Бабэліка пасалілі і з'елі з півам. Пасля вячэры засталося шмат рыбных, вадзяніковых і русалчыных костак. Барыс загадаў выкапаць недалёка ад ракі вялікі курган і пахаваць там косткі. Месца тое атрымала моцную рыбную энергетыку і праз шмат стагоддзяў на кургане адкрылася рыбная крама «Віталюр».

Дык вось, даражэнькія мае, адкуль пайшла традыцыя скакць улетку з маста ў Бярэзіну. Але не раю вам паўтараць учынак князя і яго дружыны: вы рызыкуеце што-небудзь сабе адбіць. І памятайце: каб паспяхова здзейсніць традыцыйны скок з маста, трэба быць або князем Барысам, або карэнным барысаўчанінам.

АРСЕНІЙ ПОПЕЛЬ

# ВАРТАВЫ– НЕДАРЭКА

Крэпасная сцяна Барысаўскага замка высокая і моцная: прастора паміж дзвюх бярвеністых сцен запоўненая зямлёй. Аднак і яе крэпасць не была б надзейнай, калі б не зоркія вочы вартавых, якія няспынна ходзяць  наперад і назад уздоўж сцяны, глядзяць, не спыняючыся, на наваколлі горада з байніц кутніх веж.

